Я. Колас у сваіх творах надае ўвагу лірычным апісанням прыроды, тым самым робіць акцэнт, што прырода і чалавек – адзінае цэлае, знітаванае спрадвеку. Быкаў жа большую ўвагу ўдзяляе апісанню не знешніх абставін, а ўнутранага свету чалавека, яго псіхалагічнага стану.

Але галоўнае, вызначальнае адрозненне прыпавесцяў і казак у тым, што Колас – аптыміст, і аптымістам ён застаецца ў любой сітуацыі. Быкаў жа ў вечнай спрэчцы рамантызму і рэалізму нязменна аддаваў перавагу жорсткаму рэалізму, выяўленчых магчымасцей якога дастаткова, каб сказаць пра чалавека і свет, бо сама рэчаіснасць дае такія прыклады ўзлёту чалавечага духу і яго падзення, што ніякі, нават самы фантастычны сюррэалізм не здольны прыдумаць. «Аптымізм» Быкава дастаткова моцна праяўляецца ў прыпавесці «Кошка і мышка». Так, «мышка да канца заставалася аптымісткай», але гэта хворы, нічым не абгрунтаваны аптымізм. Паміж такім аптымізмам, які паказаны ў гэтай прыпавесці, і песімізмам сцёрты ўсе сэнсавыя межы. Такі падыход да паказу рэчаіснасці дазваляе законы рэальнасці В. Быкава паставіць побач з законамі вядомага песіміста Мэрфі, у той час як роздумы герояў казак аб сутнасці чалавечага жыцця і шчасця ў многім нагадваюць папулярныя выказванні Д. Карнегі: «Жыццё – гэта самае большае шчасце на Зямлі», «Шчасце можа быць поўным толькі тады, калі ўсе навокал адчуваюць сябе шчаслівымі» і г.д.

Падводзячы вынікі, лічым неабходным успомніць галоўны крытэрый твора – своечасовасць і абавязковасць яго ўзнікнення. Я. Колас і В. Быкаў бытна рэагавалі на праблемы чалавечага жыцця, праўдзіва даследуючы яго магутныя сілы. Званне сапраўднага пісьменніка – самая значная ацэнка творчай спадчыны мастака слова. Званне, якое было заслужана лепшымі сынамі Беларусі – Я. Коласам і В. Быкавым.

**Літаратура**


1. Борев Ю.Б. Эстетика.– М., 1981.
2. Колас Я. Казкі жыцця.– Мн., 1989.
3. Быкаў В. Пахаджанне.– Вільня, 2001.


## ЛІНГВІСТЫЧНЫ АНАЛІЗ ВЕРША Я. ЯНІШЧЫЦ «ТЫ ПАКЛІЧ МЯНЕ. ПАЗАВІ...»


**Н.А. Шэпетунка**

Навуковы кіраўнік: В.М. Шавель


Палеская ластаўка. Нельга падабраць іншае, больш красамоўнае параўнанне, якое б такім чынам перадавала сутнасць паэтычнай натуры, існасць жыцця і творчасці гэтай выдатнай паэткі. Яна была ластаўкай, якая ўвесь час імкнулася да неба, сонца і цяпла; непрыручанай птушкай, якая ўзляцела высока да зорнага небасхілу беларускай паэзіі, каб застацца на ім назаўсёды.

Яна – Яўгенія Янішчыц. Кажуць, што паэзія прыцягвае лёс. Можна заставацца скептыкам, але цяжка не ўбачыць таямнічае пасланне, якое да гэтага часу захоўвае імя паэткі. «Я – геній» не крычала, а дбайна даказвала паэтэса кожным сваім новым вершам. Але, акрамя гэтага высокага звання, было яшчэ адно з супрацьлеглым знішчальным зместам, закладзенае ў прозвішчы: Я нішчая, Я нішчу… Сапраўды, Я. Янішчыц была геніем, жыццё якога было «нішчым» на сапраўднае чалавечае шчасце. Геніем, якому было прадвызначана знішчыць сябе.

Яўгенія Янішчыц да апошняга змагалася, прагнула вырвацца з зачараванага кола балючых пакут. І, вяртаючыся да пытання загадкавай сувязі творчасці і лёсу, можна прывесці радкі, якія з яўляюцца прадчуваннем уласнага заўчаснага выраю: «Як птушку ў блакіце // мяне застане гром / А будзе што не так, малю: // Скруціце стомленае крылле / І кінь це ў родную раллю». Такім чынам, у творчасці паэткі прысутнічае «касандраўскі пачатак» – здольнасць прадбачыць будучыню (Касандра прадказала пагібель Троі ў час яе найбольшага росквіту і магутнасці) [1, 236 ].

Але… Вернемся назад, да радкоў, з якіх пачынаўся першы, але імклівы, шматабяцаючы і, як здавалася, бязмежна шчаслівы палёт палескай ластаўкі.

А пачынаўся ён з любві. З любві, пра якую так даверліва, усхвалявана пісала паэтка. З любві, якая натхніла на стварэнне бессмяротнага помніка інтымнай паэзіі – верша «Ты пакліч мяне. Пазаві...», які прынёс стваральніцы славу самай лірычнай паэтэсы беларускага краю. Менавіта гэты верш стаў першым, якім Я. Янішчыц гучна заявіла пра сябе. У ім упершыню была выказана ісціна, у якую да апошняга свайго ўздыху імкнулася верыць паэтка: аснова ўсяго жывога на Зямлі – Любоў, без яе немагчыма чалавечае існаванне.

Каб зазірнуць у раскрыленую душу паэткі, з якой яна даверліва ішла насустрач жыццю, мэтазгодна разгледзець верш на чатырох узроўнях лінгвістычнага аналізу.

«Ты пакліч мяне. Пазаві...» – ужо адзін гэты радок, які даў назву вершу, дазваляе сцвярджаць, што перад намі верш-заклік, верш-запавет і ў пэўнай ступені – верш-настаўленне. І хоць у назве выкарыстаны два дзеясловы загаднага ладу, мы не можам гаварыць, што ён уяўляе сабой загад. Хутчэй, гэта верш-просьба, верш-зварот не проста да нейкай пэўнай асобы, а да таго, хто здольны пачуць, адгукнуцца і зразумець. І цяжка сказаць: верш з'явіўся ў выніку закаханасці, ці гэта ўсё ж было прадчуванне кахання, чаканне, якое суправаджаецца філасофскім роздумам пра сутнасць любві.

Адно з дамінантных слоў у вершы – слова «дарога», ужытае двойчы. Менавіта яно з'яўляецца ключавым словам, вобразам-тыпам у творчасці Я. Янішчыц. Паэтэса параўноўвала сваё жыццё з дарогай, тым самым укладваючы у яго глыбокі ўнутраны змест. У дадзеным вершы слова «дарога», акрамя свайго непасрэднага значэння, набывае глыбокую псіхалагічную і эмацыянальную нагрузку. Паэтэса стаяла на «дарозе жыцця шырокай», якая здавалася бязмежна доўгай і шчаслівай. Але Я. Янішчыц хутчэй за ўсё і не думала, што «сто дарог» за яе плячыма – гэта не мінулае, а сто дарог, на скрыжаванні якіх ёй наканавана лёсам было апынуцца. І разуменне гэтага прыйшло потым. Менавіта гэтым быў абумоўлены выбар вобраза дарогі як вобраза-тыпа, які беспамылкова перадае сутнасць яе жыцця. А ўспомніўшы сусветную літаратуру, разумеем, што гэты вобраз з'яўляецца адначасова і вобразам-архетыпам, да якога звяртаюцца мастакі зноў і зноў.

Разглядаючы фанетычную канву твора, увагу прыцягвае наяўнасць паўтораў: першы радок першай умоўнай страфы разам з першым радком апошняй страфы ўтварае своеасаблівае страфічнае кальцо, што надае вершу большую сілу гучання. Кожным трэцім радком паэтка нібыта пераконвае, што ўсё «пачынаецца з любві». Дзякуючы і ўдалай анафары, верш набывае асаблівую аптымістычную напоўненасць.

Аналізуючы верш на марфалагічным узроўні, мэтазгодна разгледзець адносіны часцін мовы, ужытыя ў вершы. Трэба зазначыць, што ў вершы 14 дзеясловаў (у тым ліку чатыры разы ўжыты дзеяслоў «пачынаецца», пяць дзеясловаў загаднага ладу). Дзеясловы ўжыты ў трох часавых формах: у форме цяперашняга часу (пачынаецца, прыручаецца, жыць), прошлага часу (выбеглі), будучага (заблудзімся). Розныя дзеяслоўныя формы пацвярджаюць працягласць дзеяння ў часе, яго ўсеаб'емнасць, да якой імкнулася паэтка.

У вершы толькі сем прыметнікаў. Гэта падаецца дзіўным, калі гаварыць аб алегарычнасці і вобразнасці верша – якасцях, якія маюць на ўвазе ўжыванне вялікай колькасці прыметнікаў. Але Я. Янішчыц выкарыстала іншы спосаб, таленавіта спалучыўшы дзеясловы, назоўнікі і прыслоўі. А невялікая колькасць ужытых прыметнікаў надае яшчэ большую значнасць кожнаму з іх.

Асаблівую цікавасць уяўляе лексічная характарыстыка верша. У яе межах мэтазгодна скласці лексічны слоўнік верша, які дапаможа глыбей зразумець напоўненасць кожнага слова.

Гавораць, што сакрэт паэзіі заключаецца ў спалучэнні слоў. Янішчыц і тут праявіла свой шматгранны талент. Напрыклад, ужыўшы гэты у сваім вершы эпітэт «хмельныя травы», паэтка спадзявалася, што кожны чытач спытае ў сябе, дзе знаходзяцца гэтыя хмельныя травы шчасця. Каб знайсці адказ на гэта пытанне, трэба шукаць і верыць, што ўсё, нават самая «простая ява» пачынае свой выток з любві.

Словазлучэнне «не крывіць душою» – удала ўжыты фразеалагізм. Пацвердзіць гэта можа і лінгвістычны эксперымент: можна проста ілгаць, проста быць самім сабой, не здраджваць. Не крывіць душой – гэта сукупнасць усіх вышэй пералічаных дзеянняў і нешта большае.

Верш Янішчыц можна разглядаць як адказ на вечнае філасофскае пытанне: што ёсць любоў? Формула любві паэткі выглядае наступным чынам: любоў = поспех + першыя крокі + адчужэнне + боль + нянавісць= = жыццё. Можа з'явіцца пытанне: ці прыносіць любоў боль, нараджэнне нянавісці? Адказ знойдзем ў неперараўзыдзенага класіка філасофскай лірыкі А. Хаяма:

Любовь вначале ласкова всегда.
В воспоминаньях ласкова всегда.
А любишь – боль. И с жадностью друг друга
Терзаем мы и мучаем. Всегда [1, 165].

Накладваючы гэту формулу на жыццё самой паэткі, мы знаходзім яшчэ адно пацверджанне, што паэзія прыцягвае лёс, бо жыццё Янішчыц прайшло па такому, ёй жа напісанаму сцэнарыю.

Аналізуючы верш на сінтаксічным узроўні, неабходна зазначыць вялікую колькасць інверсійных канструкцый. Інверсія дазваляе сканцэнтраваць увагу на сэнсе слоў, на якія падае лагічны націск, як на словах сэнсава значных. Асабліва гэта датычыцца анафары «пачынаецца».

Выбраная форма сказаў збліжае верш Янішчыц з малітваю. Гэта падабенства праяўляецца не толькі ў сінтаксісе, але і ўсеаб'емнасці гучання, пераканальнасці, цэласнасці. Верш не падзелены на страфы, бо нельга падзяліць тое, што аб'яднана ў адзінае цэлае любоўю.

Вядома, што паняцце любоў больш шырокае, чым паняцце каханне. Але ў сваім вершы Янішчыц паміж імі ставіць знак роўнасці, надаючы любові ўсеаб'емнае, вялікае ачышчальнае, жыццясцвярджальнае гучанне. Праз сто сваіх нястомных дарог паэтка пранесла гэтае пачуццё. Ёй хацелася, каб яно пульсавала ўсё жыццё, хацелася яшчэ раз пачуць яго водгук, бо інакш нельга было жыць. Чалавек працягвае жыць да таго часу, пакуль верыць, што ўсё на гэтым свеце пачынаецца з любві.

**Літаратура**

1. Хайям О. Рубаи.– М., 2004.